МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

На правах рукапісу
УДК 821.161.3+821.162.1

Любчанка
Аляксей Аляксандравіч

# Рэцэпцыя экзістэнцыялізму ў беларускай і польскай прозе другой паловы XX стагоддзя

Дысертацыя
на саісканне акадэмічнай ступені магістра філалагічных навук
па спецыяльнасці (1-21 80 10 Літаратуразнаўства)

Навуковы кіраўнік
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Заяц Н.В.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск, 2016

# РЭЗЮМЭ

Работа 72 с., 2 главы, 45 крыніц

ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛІЗМ, ПРОЗА, БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА, ПОЛЬСКАЯ ЛІТАРАТУРА

**Аб’ект** даследавання – творчасць беларускіх (У. Караткевіч, В. Быкаў) і польскіх (В. Гамбровіч, Е. Анджэеўскі) празаікаў другой паловы ХХ стагоддзя.

**Мэта** работы – даследаваць асаблівасці рэцэпцыі экзістэнцыялізму ў беларускай і польскай прозе другой паловы ХХ стагоддзя.

**Метадалагічнай базаю** навуковай работы сталі напрацоўкі заснавальнікаў філасофіі экзістэнцыялізму А. Камю, Ж.-П. Сартра, М. Хайдэгера і інш., замежных і айчынных тэарэтыкаў і гісторыкаў літаратуры, літаратуразнаўцаў і крытыкаў. Выкарыстоўваюцца метад крытычнага аналізу навуковай літаратуры, асноўныя прыёмы кагнітыўнага і кампаратыўнага аналізу, герменеўтычны метад, а таксама параўнальна-тыпалагічны, структурна-аналітычны метады.

**Вынікі даследавання.** У рабоце выяўлены асаблівасці рэалізацыі экзістэнцыяльных тэдэнцый у творах беларускіх празаікаў У. Караткевіча і В. Быкава; прааналізаваны мастацкія тэксты В. Гамбровіча і Е. Анджэеўскага ў аспекце перасаэнсавання аўтарамі філасофіі экзістэнцыялізму; праведзены параўнальна-тыпалагічны аналіз творчасці вывучаемых празаікаў са спадчынай пісьменнікаў і філосафаў – заснавальнікаў традыцыі экзістэнцыялізму ў Заходняй Еўропе; вызначаны і даследаваны экзістэнцыяльныя кантэксты польскай і беларускай літаратуры, выяўлены асаблівасці рэцэпцыі экзістэнцыялізму ў беларускай і польскай літаратурах.

Матэрыялы даследавання маюць тэарэтычную і практычную каштоўнасць і могуць выкарыстоўвацца пры далейшым навуковым асэнсаванні філасофіі экзістэнцыялізму і выяўленні яго рэцэпцыі ў творчасці беларускіх і польскіх празаікаў другой паловы ХХ стагоддзя, у выкладанні гісторыі сусветнай і беларускай літаратуры, пры падрыхтоўцы семінараў і спецкурсаў, стварэнні падручнікаў, метадычных дапаможнікаў і вучэбных праграм, а таксама пры напісанні курсавых і дыпломных прац студэнтамі-філолагамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ